# МІЖНАРОДНАЕ СЯБРОЎСТВА

У канферэнц-зале нашай ВНУ на пачатку красавіка прайшла інфармацыйная гадзіна «Час дружбы», на якой прысутнічалі як беларускія, так і туркменскія студэнты. У моладзі была магчымасць не толькі больш падрабязна даведацца пра сувязі нашых краін, але і выказаць сваё меркаванне на гэты конт.

Перад студэнтамі выступілі прарэктар нашага ўніверсітэта Валянціна Васільеўна Багатырова, прарэктар па выхаваўчай рабоце Ірына Васільеўна Бондал і намеснік дэкана па вучэбнай рабоце факультэта навучання замежных грамадзян Вольга Анатольеўна Любчанка, якія расказалі пра супрацоўніцтва Беларусі з Туркменістанам.

Затым метадыст аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю Вольга Уладзіміраўна Пуцеева прадставіла прэзентацыю пра ўдзел студэнтаў з Туркменістана ў розных мерапрыемствах, што ладзяцца ў нашай альма-матар.

Так, туркменскія хлопцы і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў Тыдні памяці Машэрава, у гісторыка-патрыятычных рэйдах «Памяць», добраўпарадкоўвалі месцы воінскіх захаванняў, праходзілі займальныя квэсты, накіроўваліся на экскурсіі па горадзе і вобласці і інш.

У планах – паездка студэнтаў з Туркменістана ў Шклоўскі раён, на малую радзіму Паліны Андрэеўны, жонкі Пятра Машэрава.

Напрыканцы сустрэчы пяцікурснікі юрыдычнага факультэта з Туркменістана расказалі пра тое, як ім жывецца і вучыцца ў Беларусі.

**_Лізавета ЯСЮКЕВІЧ,_**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**